Голас Радзімы

№ 34 (1760)
26 жніўня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



Фота М. ЖЫЛІНСКАГА.

Мой родны кут,
дзе ёсць такія словы,
каб без паўтораў
выказаць шчэ раз,

што я ў цябе ўлюбёны,
што сумую,
калі з табой ў разлуцы
доўгі час.

падзеі • людзі • факты

КАСМІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

У ПАЛЁЦЕ «САЮЗ Т-7»

З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ ТАСС

У адпаведнасці з праграмай даследавання касмічнай прасторы 19 жніўня 1982 года ў 21 гадзіну 12 мінут маскоўскага часу ў Савецкім Саюзе ажыццёўлены запуск касмічнага карабля «Саюз Т-7».

Касмічны карабель пілатуе экіпаж: камандзір карабля двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР палкоўнік Леанід Папоў, бортінжынер кандыдат тэхнічных навук Аляксандр Сераброў і касманаўт-даследчык Святлана Савіцкая.

Праграма палёту прадугледжвае стыкоўку карабля «Саюз Т-7» з арбітальным комплексам «Салют-7» — «Саюз Т-5». Экіпажу карабля таварышам Папову, Сераброву і Савіцкай трэба выканаць праграму навукова-тэхнічных і медыка-біялагічных даследаванняў і эксперыментаў сумесна з касманаўтамі Беразавым і Лебедзевым, якія працуюць на борце комплексу з 14 мая 1982 года.

* * *

20 жніўня 1982 года ў 22 гадзіны 32 мінуты маскоўскага часу здзейснена стыкоўка касмічнага карабля «Саюз Т-7» з арбітальным комплексам «Салют-7» — «Саюз Т-5», пілатуемым Анатолем Беразавым і Валянцінам Лебедзевым.

Пасля пераходу Леаніда Папова, Аляксандра Сераброва і Святланы Савіцкай у памяшканне станцыі ў калязямнай касмічнай прасторы пачаў функцыяніраваць пілатуемы навукова-даследчы комплекс «Салют-7» — «Саюз Т-5» — «Саюз Т-7». Экіпаж з пяці касманаўтаў, у складзе якога ўпершыню працуе жанчына-касманаўт, прыступіў да выканання сумесных даследаванняў.

Навуковая праграма разлічана на сем дзён.



Касмічны экіпаж карабля «Саюз Т-7».

ПАПОЎ

ЛЕАНІД ІВАНАВІЧ

Двойчы Герой Савецкага Саюза лётчык-касманаўт СССР Леанід Іванавіч Папоў нарадзіўся 31 жніўня 1945 года ў горадзе Александрыя Кіраваградскай вобласці.

Пасля заканчэння ў 1968 годзе Чарнігаўскага вышэйшага ваеннага авіяцыйнага вучылішча лётчыкаў імя Ленінскага камсамола служыў лётчыкам-знішчальнікам у Ваенна-Паветраных Сілах.

Л. Папоў — член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1971 года.

У 1976 годзе без адрыву ад работы ў Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў скончыў Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю. Гагарына.

Л. Папоў здзейсніў два касмічныя палёты. Першы палёт працягласцю 185 сутак быў выкананы ім у 1980 годзе ў якасці камандзіра асноўнай экспедыцыі на станцыі «Салют-6». У другім палёце ў маі 1981 года Л. Папоў з'яўляўся камандзірам міжнароднага савецка-румынскага экіпажа.

СЕРАБРОЎ

АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ

Аляксандр Аляксандравіч Сераброў нарадзіўся 15 лютага 1944 года ў Маскве.

У 1967 годзе ён скончыў Маскоўскі фізіка-тэхнічны інстытут. Затым на працягу дзевяці гадоў займаўся навуковай дзейнасцю на адной з кафедр гэтага інстытута.

З 1976 года кандыдат тэхнічных навук А. Сераброў працуе ў канструктарскім бюро. Ён праявіў сябе тэхнічна адукаваным і ініцыятыўным супрацоўнікам, здольным самастойна рашаць складаныя інжынерныя і навуковыя задачы. Удзельнічаў у распрацоўцы і выпрабаваннях касмічных апаратаў.

А. Сераброў — член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1976 года.

Аляксандр Сераброў прайшоў поўны курс падрыхтоўкі да палётаў на караблі «Саюз Т» і арбітальнай станцыі «Салют».

САВІЦКАЯ

СВЯТЛАНА ЯЎГЕНЬЕЎНА

Святлана Яўгеньеўна Савіцкая нарадзілася 9 жніўня 1948 года ў Маскве.

Са школьных гадоў пачала займацца авіяцыйнымі відамі спорту. Пасля заканчэння Цэнтральнай лётна-тэхнічнай школы ДТСААФ СССР і Маскоўскага авіяцыйнага інстытута імя Сярго Арджанікідзе працавала лётчыкам-інструктарам. З 1976 года С. Савіцкая, прайшоўшы курс абучэння ў школе лётчыкаў-выпрабавальнікаў, займаецца выпрабавальніцкай работай. Яна асвоіла больш дваццаці тыпаў самалётаў, мае налёт 1 500 гадзін і кваліфікацыю «Лётчык-выпрабавальнік 2-га класа». Прайшла поўны курс падрыхтоўкі да палёту на станцыі «Салют» і караблі «Саюз Т» у якасці касманаўта-даследчыка.

С. Савіцкая — заслужаны майстар спорту СССР, устанавіла 18 авіяцыйных сусветных рэкордаў, у 1970 годзе была абсалютнай чэмпіёнкай свету па вышэйшаму пілатажу.

Святлана Савіцкая — член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1975 года. Яна з'яўляецца членам Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.

АФІЦЫЙНЫЯ СУСТРЭЧЫ

ПАСОЛ ГДР НАВЕДАЎ МІНСК

У Мінску пабываў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў СССР Э. Вінкельман з жонкай. Разам з ім былі саветнік пасольства ГДР у СССР Х. Хаўбальд і назначаны Генеральным консулам ГДР у Мінску П. Якабс.

Э. Вінкельман нанёс візіт намесніку міністра замежных спраў БССР Л. Максімаву, сакратару ЦК Кампартыі Беларусі Ю. Колакалаву, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Палякову, Старшыні Савета Міністраў БССР А. Аксёнаву. Гасцей сталіцы Савецкай Беларусі прыняў намеснік старшыні Мінскага гарвыканкома А. Якімчук. Адбыліся гутаркі, якія прайшлі ў сяброўскай абстаноўцы.

Пасол ГДР у СССР Э. Вінкельман наведаў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У кнізе ганаровых гасцей ён пакінуў запіс. Э. Вінкельман, П. Якабс і суправаджаючыя асобы ўсклалі вянок да помніка-абеліска на плошчы Перамогі.

Былі ўскладзены кветкі ля мемарыяльнай дошкі Герою Савецкага Саюза Фрыцу Шменкелю.

Пасол ГДР у СССР Э. Вінкельман даў прыём з выпадку назначэння новага Генеральнага консула ГДР у Мінску. Э. Вінкельман і суправаджаючыя яго асобы, а таксама Генеральны консул ГДР у Мінску П. Якабс пабывалі ў Мінскім вытворчым аб'яднанні па выпуску працяжных і адразных станкоў імя С. Кірава, якое многа гадоў падтрымлівае сяброўскія сувязі з працоўнымі горада Рула ў ГДР.

Э. Вінкельман наведаў таксама Дом-музей І з'езда РСДРП, пабываў разам з іншымі афіцыяльнымі асобамі на мемарыяльным комплексе «Хатынь». Пасол усклаў кветкі да Вечнага агню, пакінуў запіс у Кнізе ганаровых наведвальнікаў.

У Хатыні, ля гранітнай Сцяны памяці, 19 жніўня адбыўся антываенны мітынг працоўных Мінска сумесна з актывістамі прафсаюзнага руху Японіі, якія прыбылі ў Савецкі Саюз з місіяй міру.

З глыбокім пачуццём павагі адносімся мы да японскіх прыхільнікаў міру, сказаў старшыня Мінскай секцыі Савецкага камітэта ветэранаў вайны В. Сінчылін. Савецкія людзі высока цэняць намаганні міралюбівых сіл Японіі, якія выступаюць за мір і раззбраенне, за тое, каб ніколі не паўтарыліся трагедыі Хатыні, Хірасімы і Нагасакі. Ад імя ветэранаў другой сусветнай вайны прамоўца заклікаў аддаць усе сілы барацьбе за мірную будучыню планеты, за права людзей на жыццё.

У канцэртнай зале гасцініцы «Турыст» члены японскай дэлегацыі сустрэліся з прадстаўнікамі грамадскасці Мінска. Намеснік адказнага сакратара Таварыства япона-савецкай дружбы Тосіка Иокасука падкрэсліла, што прэзідэнт ЗША гаворыць аб магчымасці абмежаванай ядзернай вайны, аб нанясенні папераджальнага ўдару. Але гэта ж вар'яцтва: нельга перамагчы ў такой вайне. Аб гэтым адкрыта заявілі трыццаць мільёнаў японцаў, якія паставілі свае подпісы пад патрабаваннем поўнай забароны ядзернай зброі.

НА ЗДЫМКУ: госці з Японіі на вуліцах Мінска.

МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

ДРУЖБА І СУПРАЦОЎНІЦТВА

Дружба і шматбаковае супрацоўніцтва народаў СССР і Індыі няўхільна развіваюцца і мацнеюць на аснове дагавора, які адпавядае карэнным інтарэсам абедзвюх краін. Аб гэтым гаварылася на ўрачыстым сходзе прадстаўнікоў грамадскасці, які адбыўся ў Мінску. Ён быў прысвечан 35-годдзю незалежнасці Індыі і 11-й гадавіне Дагавора аб міры, дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і Рэспублікай Індыяй.

Старшыня праўлення Мінскага гарадскога аддзялення Таварыства савецка-індыйскай дружбы, намеснік міністра асветы БССР Р. Сярноў адзначыў, што савецкія людзі поўныя рашучасці разам з індыйскімі сябрамі з яшчэ большай энергіяй умацоўваць традыцыйныя вузы дружбы ў інтарэсах народаў абедзвюх краін, усеагульнага міру і міжнароднай бяспекі. Працоўныя Беларусі высока цэняць стваральны талент народа дружалюбнай краіны, яго імкненне да міру, актыўна ўдзельнічаюць у савецка-індыйскіх эканамічных і культурных сувязях.

Стажор Мінскага медыцынскага інстытута Менон Гавінда Гапінат выказаў падзяку савецкім людзям за дапамогу ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, развіцці эканомікі і культуры Індыі.

ГОСЦІ З-ЗА МЯЖЫ

ДЭЛЕГАЦЫЯ З ПОЛЬШЧЫ

Нашу рэспубліку наведала партыйная дэлегацыя Седлецкага ваяводскага камітэта ПАРП на чале з Е. Свідзерскім. Госці з ПНР пабывалі на заводзе аўтаматычных ліній, на Мінскім фарфоравым заводзе, дзе пазнаёміліся з арганізацыяй сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя ўтварэння Савецкага Саюза.

Партыйная дэлегацыя з ПНР зрабіла паездку па Слуцкаму раёну, наведала саўгас «Белічы», калгасы «Ленінскі шлях» і імя Кірава.

РАСКАЗ ПРА ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕ ЎРАДЖАЙ

АДЗІН ДЗЕНЬ ЖНІЎНЯ

НАШЫ продкі вельмі трапна і дальнабачна нараклі апошні месяц лета жніўнем. Як даўней, так і зараз слова жніво найчасцей гучыць у гэтую пару на вёсцы. Уборка збожжа, нарыхтоўка кармоў, насення — галоўны клопат калгасаў і саўгасаў Беларусі сёння. І ад таго, як пройдзе жніво, які будзе зняты ўраджай, залежыць наш заўтрашні дастатак. Таму з такой адказнасцю, руплівасцю і самаадданасцю працуюць на палетках і нівах сяляне. Таму да іх звернута зараз такая пільная ўвага. Не мінае і дня, каб па радыё, тэлебачанні, у газетах не расказвалася пра перадавікоў жніва, пра лепшыя звенні і ўзорныя гаспадаркі.

Выдатна працуюць на жніве і хлебаробы Аршаншчыны. На сёння ўборка тут амаль завершана.

Наш расказ пра адзін звычайны дзень сельскагаспадарчага жыцця Аршанскага раёна — маляўнічага кутка беларускай зямлі, што ляжыць на шырокіх абшарах абапал Дняпра.

Мне давялося назіраць за работай механізатараў і хлебаробаў, размаўляць з героямі жніва і кіраўнікамі калгасаў. Пра самае цікавае я і хачу сёння расказаць.

ПЕРШАЯ гаспадарка, якую мы з работнікам райкома партыі Уладзімірам Сізікавым наведалі, быў калгас імя Янкі Купалы. Гэта на яго тэрыторыі на стромкім беразе Дняпра раскінулася — цяпер ужо вядомая на ўвесь свет — вёска Ляўкі, дзе калісьці жыў вялікі беларускі пясняр, а зараз адкрыт запаведнік, музей яго імя. Але не толькі дзякуючы Я. Купалу славіцца калгас. Гаспадарка— адна з мацнейшых у раёне, адна з перадавых.

Вёска Зубава — цэнтральная сядзіба калгаса імя Я. Купалы. Пакуль мы даехалі да будынка праўлення, на вуліцах сустрэлі ўсяго некалькі чалавек — бабульку і малых. Была дзевятая гадзіна раніцы. Усё працаздольнае насельніцтва ў гэты час на палетках. У праўленні таксама нікога з кіраўніцтва не аказалася. Яно, як жартам гаварыў мой спадарожнік, «лётае па сваіх уладаннях». Гэта і сапраўды так — за дзень старшыні, аграному, інжынеру, заатэхніку даводзіцца наведаць многія ўчасткі работ, наездзіць сотні кіламетраў. Іх працоўны дзень пачынаецца на світанні, а заканчваецца, калі на небе загараюцца зоркі. Не менш напружана даводзіцца працаваць і радавым калгаснікам. Але ніхто з іх не зважае на такія «перагрузкі», кожны ведае: так трэба.

Калі ў Зубаве было малалюдна, то ў яго аколіцах, на велізарных абшарах ніў і сенажацяў сапраўдны людскі вір — шумяць камбайны, убіраючы ў сябе калоссі, гудуць машыны, якія адвозяць зерне ў сховішчы і на ток, гамоняць калгаснікі і тыя, хто прыйшоў ім на дапамогу — мясцовыя медыкі, культасветработнікі, работнікі гандлю.

На поле, куды мы прыехалі, жалі ячмень. Па ніве павольна рухаліся сем камбайнаў. Пярэдні вялі Пятрусь Рабекін і Уладзімір Навуменка. Гэтае звяно — лідэр калгаснага жніва. На другім месцы экіпаж у складзе механізатара Міколы Рабекіна і дырэктара тутэйшага Дома культуры Міхася Магера! Гэты факт — пераканаўчая ілюстрацыя закліку: жывеш на вёсцы, ведай тэхніку. А Міхась, як відаць, тэхніку і сельскагаспадарчую справу ведае выдатна. У той самы час ён і са сваёй асноўнай прафесіяй спраўляецца найлепшым чынам.

У час кароткага перапынку, калі камбайнеры і іх памочнікі адпачывалі, я падышоў да лідэраў і папрасіў Петруся Рабекіна расказаць пра сябе, пра тое, як яму сёлета працуецца.

— Гэта ўжо пятнаццатае маё жніво, — сказаў звенняві, — дзевяць гадоў я працаваў памочнікам, а вось ужо шостае лета камбайнерам. А ўвогуле я патомны хлебароб. Мае дзед, бацька прысвяцілі сябе зямлі. Таму ў маім поспеху няма нічога выключнага. Калі любіш справу, то яна і ладзіцца. Што датычыцца сёлетняй уборкі збожжа, то скажу: яна арганізавана надзвычай добра. Між іншым, так было і ў папярэднія гады — такая ўжо ў нас традыцыя.

КАЛГАС імя Леніна спецыялізуецца на вырошчванні нецеляў і вытворчасці малака. Таму самае галоўнае для гаспадаркі — нарыхтоўка кармоў. А іх патрабуецца нямала. Адных толькі цялушак тут больш за 600 галоў. У гэтыя дні ў калгасе імя Леніна, як і паўсюль у раёне, ідзе нарыхтоўка сена, сіласу, сенажу, саломы. Працуюць усе. І працуюць ударна. На пятнаццатае жніўня тут нарыхтавана 1 050 запланаваных тон сена, а 2 350 тон сенажу і таго раней — 11 жніўня.

...На полі за вёскай Якаўлевічы — цэнтральнай сядзібай калгаса імя Леніна, быў час абеду. Тут ужо не першы год практыкуюць палявое харчаванне — перасоўная сталоўка ў прызначаную гадзіну прывозіць стравы. Між іншым абед у полі — гэта адчувальны клопат пра калгаснікаў: падсілкавацца гарачым не тое, што бутэрбродамі. Па-другое, гэта выгадна і для гаспадаркі: час абеду скарачаецца да мінімуму. А значыцца, працаўнік паспее болей зрабіць, ну і, вядома, болей зарабіць. Зарабляюць жа на жніве нямала.

Пакуль камбайнеры з памочнікамі і вадзіцелі аўтамабіляў абедаюць, калгасная рамонтная брыгада наладжвае тэхніку. Рамонтнікам у гэтыя дні спраў хапае.

У КАЛГАС «Ленінская іскра» мы завіталі надвячоркам. Але на палетках і нівах гаспадаркі праца віравала ваўсю.

Гэты калгас таксама спецыялізаваны. Тут нарыхтоўваюць насенне — і для сябе, і для іншых гаспадарак раёна. 1 030 гектараў угоддзяў яравых і азімых трэба ўбраць. Да таго ж, збажына ўрадзіла надзіва багатая. Разлічвалі ячменю збіраць з гектара па 20—30 цэнтнераў, а атрымліваюць усе 40. Так што разам з радасцю дадалося і клопату — трэба рыхтаваць новыя засекі, патрабуецца дадатковая тэхніка, а тую, што задзейнічана на ўборцы, неабходна выкарыстоўваць яшчэ больш рацыянальна.

Трэба сказаць, што і тут, як і ў іншых калгасах, мы бачылі: у хлебаробаў выдатны рабочы настрой. А рэкорды іншых дык проста здзіўляюць. Напрыклад, сямейны экіпаж — бацька з сынам — Васіль і Ігар Панамарчукі — штодня ўбірае збожжа самае меншае з сямі гектараў, тады як норма складае 4,6. Ці звяно трактарыстаў-вадзіцеляў Васіля Хуцкага і Змітра Радзькевіча. Летась яны звезлі з ніў 1 200 тон саломы — 70 працэнтаў усёй калгаснай. Сёлета таксама блізкія да паўтарэння свайго рэкорду.

Вышэй прыведзеныя прыклады — выключныя. Але і астатнія калгаснікі працуюць няблага. Тым, хто перавыконвае дзённыя нормы выпрацоўкі, а гэта робіць большасць калгаснікаў, даплачваецца да заробленага па тарыфу 60 працэнтаў. Акрамя таго, ёсць прэміі за якасць, за лепшыя паказчыкі на жніве.

Размаўляючы ў час кароткага перапынку з хлебаробамі, я запытаўся ў іх, колькі яны зарабляюць на ўборцы.

— Хто як, — жартуе В. Хуцкі і дадае: — Мы з Змітром дык толькі грашыма па 300 рублёў і болей. Акрамя таго, атрымліваем яшчэ і зерне, салому, сена, сілас. Так што добра працаваць ёсць сэнс.

Ну а раз ёсць сэнс працаваць, то значыцца і праца будзе ладзіцца, значыцца можна спадзявацца і на самыя лепшыя яе вынікі.

ТОЛЬКІ дзень жніва апісаны ў нашым расказе, толькі некалькі гаспадарак мы наведалі, але і гэтага дастаткова каб уявіць размах і рытм беларускага жніва, каб пераканацца, што і сёлетні жнівень адпавядае сваім зместам назве.

Мікола ШЭЛЯГОВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: камбайнер П. РАБЕКІН з памочнікам У. НАВУМЕНКАМ.

ГАЛОЎНАЯ ВУЛІЦА АЎСЯНКІ

БУДУЕМ ДОМ

Да вёскі Аўсянка, цэнтральнай сядзібы калгаса «XVII партз'езд» Горацкага раёна, мы пад'ехалі яснай ліпеньскай раніцай. Панарама жылога масіву адкрылася нечакана: справа ад шасэ раптам успыхнула, заззяла ў шырокіх вокнах дамоў сонца. Яно «пабегла» па шкле шматпавярховага будынка, потым другога, трэцяга... Здавалася, мы трапляем у вялікі сонечны горад.

КЛЮЧЫ ШЧАСЦЯ

Вяселле... Амаль уся вёска сабралася, каб павіншаваць з гэтай падзеяй шафёра Рыгора Халецкага і повара Святлану Ленчыкаву. «Добрая пара», — гаварылі, любуючыся маладымі, госці. І не толькі таму, што Рыгор і Святлана былі ў вясельным убранні. Працаўнікі — пашукаць такіх. Да справы, грамадскага даручэння ставяцца з душой, да людзей — з увагай, цеплынёй. Шмат добрых, сардэчных слоў пачулі ў свой адрас маладажоны. А старшыня калгаса Іван Мельнік ад імя праўлення ўручыў ім ключы ад кватэры.

— На ўсё жыццё запомніўся нам той шчаслівы дзень,— гаворыць Святлана, паказваючы сваю кватэру, жылая плошча якой — 65 квадратных метраў. Тут і прасторная кухня (яна хутчэй падобна да сталовай), і ванна з гарачай і халоднай вадой, і кладоўкі, цэнтральнае ацяпленне, газ. І за ўвесь гэты камфорт сям'я Халецкіх плаціць усяго пяць рублёў у месяц, таму што частку расходаў узяў на сябе калгас.

Святлана Халецкая расказала і аб іншых ільготах, якімі карыстаюцца жыхары Аўсянкі і яшчэ сямі вёсак, што ўваходзяць у гаспадарку. У прыватнасці, ёй, як маладой маці, калгас прадаставіў аплачваемы водпуск па догляду за малым. Прадукты харчавання (мяса, малако, іншыя) адпускае гаспадарка зноў жа па льготных цэнах.

У пасёлку ёсць і свой гандлёвы цэнтр, дзе розных тавараў не менш, чым у любым гарадскім універсаме або універмагу. Да паслуг жыхароў — комплексны прыёмны пункт. Тут можна пашыць модную сукенку, падстрыгчыся, адрамантаваць тэлевізар. У цэнтры пасёлка — цэлы дзіцячы гарадок з каруселямі і гушкалкамі. Але, бадай, самы прыгожы будынак яшчэ ўзводзіцца. Гэта будзе сярэдняя школа на 400 месц з плавальным бассейнам, спартыўнай залай, вучэбнымі кабінетамі. Праект школы распрацаваны мінскімі архітэктарамі.

НАША ВУЛІЦА

Першыя аднакватэрныя жылыя дамы калгас пачаў будаваць гадоў 14 назад. Яны і ўтварылі пазней галоўную вуліцу Аўсянкі. Быў распрацаваны генеральны план забудовы цэнтральнай сядзібы калгаса. Ім прадугледжвалася будаўніцтва розных аб'ектаў жыллёвага, бытавога і сацыяльна-культурнага прызначэння. І вось тады ўзнікла думка стварыць у гаспадарцы ўласную будаўнічую арганізацыю. У спісах кіруючага звяна з'явілася пасада галоўнага інжынера-будаўніка. Узначаліў новы калектыў Я. Калько. Ён расказвае:

— Сёння наша брыгада — гэта 30 кваліфікаваных рабочых. У яе склад уваходзяць муляры, цесляры, тынкоўшчыкі. У штаце тры брыгадзіры, адзін майстар і... аграном-дэкаратар. У нас клапоцяцца не толькі аб якасці, утульнасці і зручнасці, але і аб эстэтычным афармленні будынкаў, што знаходзяцца на тэрыторыі. Летась, напрыклад, высаджана звыш тысячы яблынь, бяроз, ліп, шмат кустарнікаў.

Зараз добраўпарадкаванае калгаснае жыллё маюць 82 сям'і. Ёсць і сучасны інтэрнат на 50 месц. Паралельна з жыллёвым і культурна-бытавым будаўніцтвам калгасныя ўмельцы ўзводзяць шмат аб'ектаў вытворчага прызначэння. Гонар гаспадаркі — свінагадоўчы комплекс на 12 тысяч галоў у год.

Добраўпарадкаванне заўсёды звязана з вялікімі клопатамі. У калгасе «XVII партз'езд» сур'ёзна падышлі да яго. Асноўныя абавязкі ўзялі на сябе зноў жа будаўнікі і служба галоўнага энергетыка. У функцыі першых уваходзіць рамонт памяшканняў, другіх — абслугоўванне электрычных і цеплавых сетак, водаправода.

СВОЙ КУТ

«Кватэра — добра, а ўласны дом — лепш»,— гэтую фразу я пачуў ад шафёра Міхаіла Хутлікава. Ён лічыць: без панадворку, каровы, птушкі вясковы чалавек не можа жыць.

Прыйшоў аднойчы Міхаіл у кантору і кажа:

— Дом хачу пабудаваць. Як быць?

Праўленне калгаса прапанавала шафёру грашовую пазыку ў памеры дзвюх з палавінай тысяч рублёў, вызначыла і ўчастак пад забудову. Міхаілу бачыўся прасторны дом з шырокімі вокнамі, з комінамі на даху. Праект такога «церама» знайшоў у альбоме, які галоўны інжынер-будаўнік калгаса спецыяльна захоўвае для індывідуальных забудоўшчыкаў. Адштукаваў Міхаіл Хутлікаў сабе дом — заглядзенне. Людзі цяпер тут ахвотна будуюцца. Як гаворыцца, урастаюць каранямі ў зямлю. Калгас і грашамі, і будматэрыяламі, і транспартам дапамагае. Тыя дамы, да якіх падведзены цяпло, газ, вада, узялі пад сваю апеку сантэхнікі, электрыкі, водаправодчыкі з камунальнай службы калгаса.

Ёсць у калгасе і такія вёскі, дзе жыхары бяруць ваду з калодзежаў, печ паляць дровамі, абеды гатуюць у гаршках. Нікольки не горш, чым у пасёлку, жывуць тут людзі. Бо і яны акружаны клопатамі гаспадаркі. Старшыня прафсаюзнага камітэта калгаса Сідараў паказаў мне кнігу ўліку тых, хто мае патрэбу ў паліве. Як правіла, да надыходу халадоў усе людзі запасаюцца хто торфам, хто дровамі, а хто вугалем. Вядома, у першую чаргу забяспечваюцца палівам людзі заслужаныя: ветэраны вайны і працы, пенсіянеры. На асобым уліку — састарэлыя, адзінокія.

Словам, у калгасе нямала зроблена для дабрабыту сялян, для іх зручнага жыцця.

Мікалай ДЫМ.

ОТВЕТЫ МИНИСТРА ОБОРОНЫ СССР МАРШАЛА СОВЕТСКОГО СОЮЗА Д. УСТИНОВА НА ВОПРОСЫ КОРРЕСПОНДЕНТА ТАСС

Вопрос: В Женеве больше полугода Советский Союз и Соединенные Штаты ведут переговоры об ограничении ядерных вооружений в Европе. Как идут эти переговоры и что могли бы вы сказать относительно позиций сторон?

Ответ: По договоренности сторон эти переговоры носят конфиденциальный характер, и, разумеется, не на пользу дела было бы предавать гласности все то, что делается и говорится на них. Советский Союз серьезно относится к этой договоренности. К сожалению, однако, этого не скажешь об американской стороне. Недавно в западной печати, в частности в американской и западногерманской, появились сообщения, раскрывающие содержание переговоров. При этом допускается серьезное искажение советской позиции.

Я понимаю тот большой интерес, который общественность проявляет к содержанию нашей позиции на переговорах. Советский Союз в Женеве внес предложения, которые предусматривают создание обширной европейской зоны сокращения и ограничения ядерного оружия от Северного Ледовитого океана до Африки, от середины Атлантики до Уральских гор.

В этой зоне предлагается сократить имеющиеся ядерные вооружения средней дальности (от 1000 км и выше, но не межконтинентальные) таким образом, чтобы на стороне СССР и НАТО через пять лет после договоренности было не более чем по 300 единиц вооружений этого класса. Сокращению подлежали бы все виды ядерных средств средней дальности — и ракеты, и самолеты. В зоне запрещалось бы развертывание ядерных вооружений новых типов, в том числе, разумеется, американских ракет как «Першинг-2», так и крылатых.

Советские предложения не предусматривают каких-либо обязательств для третьих стран. Но в суммарном уровне 300 единиц вооружений средней дальности наряду с американскими учитываются также ракеты и самолеты Англии и Франции. Советский Союз не может игнорировать тот факт, что эти средства входят в состав ядерных вооружений средней дальности стран — участниц НАТО. Они нацелены против СССР и его союзников.

Наши предложения имеют в виду осуществление в Европе и сопутствующих мер по ограничению ядерных вооружений с дальностью менее 1000 км. Такие ограничения многочисленных вооружений были бы, безусловно, в интересах всех европейских государств. Мы предложили также, чтобы ядерные вооружения средней дальности вне европейской зоны их сокращения и ограничения размещались таким образом, чтобы эти вооружения сторон не достигали объектов другой стороны в указанной зоне.

Что касается позиции США, то они по-прежнему цепляются за пресловутое «нулевое решение», то есть за полную ликвидацию всех советских ракет средней дальности наземного базирования. Это предложение, выдвинутое еще до начала переговоров, явно рассчитано на срыв договоренности. США не хотят сокращать ни на одну единицу ядерные средства средней дальности как свои, так и союзников. Они даже добиваются их увеличения. Одновременно они требуют от Советского Союза ликвидации в одностороннем порядке ракет наземного базирования, которыми он располагает уже более 20 лет. Эти ракеты являются частью давно сложившегося и устоявшегося баланса сил в Европе.

Советский Союз — об этом было заявлено на самом высоком уровне — не пойдет на одностороннее сокращение своих ядерных вооружений средней дальности, чего добиваются американцы. Вместе с тем он прилагает настойчивые усилия для успеха переговоров с США по ограничению ядерных вооружений в Европе и стратегических вооружений в целом. Наши предложения открывают реальную возможность значительного сокращения вооружений. Советский Союз подтверждает также свою готовность к освобождению Европы от ядерного оружия— и средней дальности, и тактического.

Вопрос: В последнее время на Западе на высоком уровне довольно часто распространяются утверждения о том, что США якобы «отстали» от Советского Союза в области стратегических вооружений. Что можно сказать на этот счет?

Ответ: Это — преднамеренное искажение существа вопроса. Утверждениями о «ядерном превосходстве» СССР пытаются ввести людей в заблуждение.

Всем известно, что с момента появления у США ядерного оружия Советский Союз в интересах своей обороноспособности и безопасности союзников был вынужден лишь отвечать на действия Соединенных Штатов и НАТО, принимавших на вооружение все новые и новые разновидности ядерных боеприпасов и средств их доставки. Сложившееся между СССР и США, между организацией Варшавского Договора и НАТО примерное равенство сил существует и сегодня как в области стратегических и других ядерных вооружений, так и в области обычных сил. Наличие примерного равновесия неоднократно признавалось многими политическими и военными деятелями Запада, особенно теми, кто хорошо знает суть вопроса. Факт наличия баланса сил нашел отражение и в соответствующих советско-американских соглашениях. Мы еще раз констатируем, что в действительности никакого «ядерного отставания» США нет. Те, кто пытается выдать примерное равенство за «отставание США», делают это с одной целью — прикрыть ничем не оправданную гонку ядерных вооружений.

Что же происходит на самом деле? Весьма красноречивым является заявление министра обороны США К. Уайнбергера. В интервью американским журналистам 9 августа он откровенно заявил, что все мероприятия Пентагона направлены к достижению превосходства над СССР в ядерной войне и ее завершению на выгодных для США условиях. По его словам, ядерные возможности США «должны превосходить аналогичные показатели Советского Союза на всех этапах ведения войны».

Советский Союз принципиально отвергает линию на военное превосходство. Он к этому не стремится, но и не признает такого права ни за кем другим. Достигнутое военно-стратегическое равновесие между странами социализма и миром капитализма служит фактором, сдерживающим устремления агрессивных сил. Военное равновесие на возможно более низких уровнях вооружений — таков конструктивный подход СССР к ядерному разоружению.

Важным первым шагом в деле прекращения гонки ядерных вооружений явилось бы взаимное замораживание ядерных арсеналов. Это исключало бы возможность наращивания ядерных средств, создавало бы благоприятные предпосылки для скорейшего принятия эффективных решений по сокращению и ограничению ядерных вооружений. Оно вело бы к укреплению доверия между государствами и стабильности обстановки.



У ціхай завадзі.

Фота А. НАДЗЕІНА.

ЖЫВЁМ НАДЗЕЯЙ НА ВЯРТАННЕ

РАСЧАРАВАННЕ І РАСКАЯННЕ

«Калі б Атлантыка была сушай, я з радасцю згадзіўся б перайсці яе пешшу, каб пацалаваць родную зямлю...»,— піша былы савецкі грамадзянін Рыгор Герзон з-за акіяна. Расчараваннем у абяцаным раі і раскаяннем за здзейснены ўчынак — выезд з СССР — прасякнуты радкі пісьма, якое мы прапануем чытачам «Голасу Радзімы».

Да выезду з СССР у 1980 годзе муж і жонка Рыгор і Ента Герзоны жылі ў Бабруйску. Працавалі, былі добра матэрыяльна забяспечаны, мелі сяброў, карысталіся павагай. Цяпер яны знаходзяцца ў канадскім горадзе Эдмантане. Іх пісьмо адрасавана супрацоўніку пашпартнай службы ўпраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкома, які афармляў дакументы сям'і Герзонаў для выезду за межы СССР.

«Добры дзень, паважаны таварыш!

Я Вам, вядома, не таварыш, а проста маладушны чалавек, якога недастатковае разуменне жыцця, адсутнасць логікі прывялі да ракавога кроку. Яго я зрабіў у лістападзе 1980 года, эмігрыраваўшы з Савецкага Саюза. Можа ўзнікнуць пытанне, чаму я звяртаюся іменна да Вас, але іменна Вы гутарылі са мной і адгаворвалі ад гэтага трагічнага рашэння.

Як я памыляўся, як я быў аслеплены! Я цяпер вінавачу сябе пастаянна. Чаму я тут, а не ў сябе дома, у дарагой мне краіне — сэрца ж засталося там! За што я павінен так пакутаваць? Каму патрэбна гэта трагедыя?

Азіраючыся назад, асэнсоўваючы і супастаўляючы сваё пражытае жыццё, я глыбока ўсвядоміў, што даражэй Радзімы, Савецкага Саюза няма нічога ў жыцці, як няма людзей лепшых і дабрэйшых за савецкіх.

Няма слоў, каб выказаць, як цяжка жыць удалечыні ад Радзімы, на чужыне, без усяго, што дорага і свята. А для мяне гэта наогул, як смерць.

У Савецкім Саюзе я карыстаўся ўсімі правамі, быў з усімі ў вялікай дружбе, разуменні і ўзаемнай павазе, якія праяўляліся на кожным кроку. Доўгімі бяссоннымі, кашмарнымі начамі я абдумваю, што нарабіў.

Усё перажыта разам з Радзімай: і радасці, і цяжкасці. У 16 гадоў у суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны я пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, ваяваў, быў паранены, меў урадавыя ўзнагароды. Я пакінуў краіну, у якой нарадзіўся, вырас, якой служыў, без якой жыць немагчыма. Я ўрос у яе карэннямі, там прайшло маё жыццё і там маё месца. Жыць і паміраць трэба дома, без Радзімы жыцця няма. Няма чаго на Захадзе рабіць ні мне, ні іншым людзям.

Тут ты аказваешся ў зусім чужой краіне, сярод чужых людзей з чужымі звычкамі і зусім іншым жыццёвым укладам — непрымальным для чалавека, які вырас у Савецкім Саюзе. Вельмі цяжка мне, выхаванаму савецкім ладам жыцця, на ідэалах савецкага гуманізму, на чужыне. Горш за смерць гэта — быць без Радзімы! Пакуль не пабудзеш на чужыне, не ацэніш, што згубіў.

Так яшчэ хочацца пажыць на савецкай зямлі, пад савецкім небам, падыхаць родным паветрам. У Савецкім Саюзе я жыў сапраўдным, паўнакроўным жыццём, быў асобай. Тут жа я — жывы труп. Адчай, напружанне — усяго не пералічыць. Карацей кажучы, зламанае жыццё. Цэлымі днямі і начамі думаю аб далёкай і дарагой Радзіме, пакінутым доме, сябрах, знаёмых. Толькі тут адчуваеш боль за ўсё, што згубіў.

«Райскае жыццё» за мяжой — гэта міф. Тое, што адбываецца дома— жыццё, а тут толькі абывацельскае гібенне. Адзінае, што я тут набыў, гэта крыватачную, незагойную рану ў душы. Сапраўднай культуры, калі наогул можна гаварыць пра культуру ў нашым звыклым разуменні, на Захадзе амаль няма, пануе нейкая духоўная пустэча. Тут людзям з дзяцінства ўнушаюць пакланенне перад багаццем. Грошы і бізнес пануюць над усім, зацягваюць і пагльнаюць. Няма той атмасферы дружбы, добразычлівасці, узаемадапамогі, як у СССР, а нейкія бяздушныя, абыякавыя адносіны адзін да аднаго. Нейкае ненатуральнае, несапраўднае жыццё.

Чужое, чужое, усё кругом чужое!

Гэта пісьмо для мяне — самае важнае з усяго майго жыцця. Можа яно занадта гучнае, але паверце — гэта крык маёй змучанай душы.

Ратуйце!!! Не дайце прапасці!!!

Я звяртаюся да вас з вялікай просьбай— зразумець мяне, паверыць маёй шчырасці, дараваць маю страшэнную памылку, я на каленях прашу дапамагчы вярнуцца на Радзіму ад усіх жахаў перажытага. Калі б Атлантыка была сушай, я з радасцю згадзіўся б перайсці яе пешшу, каб пацалаваць родную зямлю.

Адзінае, чым яшчэ жыву,— гэта надзеяй на вяртанне на дарагую Радзіму. Інакш мне не выжыць.

Калі б толькі вярнуцца! Я б сіл не пашкадаваў, каб на прыкладзе свайго сумнага вопыту ўтрымаць падманутых людзей ад непрадуманых і рызыкоўных крокаў, якія немагчыма сабе потым дараваць. Расказаў бы я і пра так званых «дысідэнтаў» — ўяўных абаронцаў правоў чалавека, не без удзелу якіх знявечаны лёсы многіх былых савецкіх грамадзян.

З глыбокай павагай да Вас Герзон Рыгор Юр'евіч.

З усім выкладзеным поўнасцю згодная і таксама далучаюся да напісанага. Герзон Ента Іосіфаўна».

"We Shall Overcome!"

The Peace March Stockholm-Helsinki-Leningrad-Moscow-Minsk ended in a rally held in the Byelorussian capital. And soon afterwards in Kiev, the capital of the Ukraine, girls in national costumes presented flowers to participants in another Peace March — Moscow-Kiev-Budapest-Bratislava-Vienna. These were the two routes of the Peace March-82 aimed at alerting people to the increased threat of war and at barring the way to nuclear weapons.

I am holding several silk ribbons of various colours with the names of people from the Scandinavian countries. They are the names of those who for one reason or other could not take part in the march and confirmed their support of its goals with their signatures. The 300 peace marchers from Denmark, Norway, Finland and Sweden brought to the USSR some 30,000 such ribbons. Each carries three or even four signatures. You can see how many people joined the march in their hearts. And do not forget to add to this the Soviet people who took part in the Peace March's key events. Their numbers were sometimes measured in tens of thosands.

At the concluding rally, arranged at the Central Children's Park in Minsk, the peace marchers approved a joint statement to the United Nations, the governments, parliaments, and the peoples ot the world. It said:

"Women stood up to act and men joined them in a common endeavour to save the earth from destruction.

"Representatives of public organizations from the Nordic countries and the Soviet Union have carried through a common project, a peace march. The march is showing the world that growing peace movements — in the East and West — declare together:

"No to nuclear weapons in Europe — East and West.

"No to nuclear weapons in the world.

"Yes to disarmament and peace.

"It is our conviction that use of nuclear weapons can never be justified by any objective whatsoever. Any use of nuclear weapons is a crime against man and nature.

"We, the participants in the Peace March-82, have agreed on the following:

"The necessary steps to reach our common objective, disarmament and peace, are

"— declarations by all nations in the world of no first use of nuclear weapons

"— a halt in testing, production and deployment of all types of nuclear weapons, with international agreements for verification

"— nuclear-free zones treaties for European countries — East and West — and all over the world

"— no to any proliferation of nuclear weapons

"— further concrete steps to the development of a world with more security and freedom, equality, justice and mutual respect, using the resources of the world for human needs instead of weapons

"— the world peace should be defended by every government.

"Our common march has shown that it is possible for representatives of organizations in different countries, East and West, to work together and reach an agreement on the most vital problem of all times: to save humanity from extinction.

"We call on the United Nations and all the govemments, parliaments and peoples of the world to act together as we have done during the Peace March-82, to reach an agreement.

"The time has come for the governments and parliaments to proceed from words to deeds in the field of disarmament.

"Together we shall overcome!"

Kiev.

The 1,500-year-old city staged a warm welcome for the 250 representatives from 30 countries, mostly European countries, who took part in the march.

Writer Oles Gonchar, Chairman of the Ukrainian Republican Peace Committee, in greeting the guests at a rally, said that the Soviet people well knew the price of peace. He reminded them that the Ukraine lost 4,500,000 of its people in the war. Therefore, he hoped that their meetings with the Kievans would give them even more confidence in the triumph of the cause of peace, detente and disarmament.

The column of the marchers many thousands strong passed through Kiev's streets and squares. Native Kievans and their guests joined in.

From Kiev the marchers will head for Uzhgorod, a Transcarpathian town. Then they will split into two processions and go on to Vienna through Hungary and Czechoslovakia. Marchers from Britain, Greece and West Berlin will join them in Vienna on August 6, which marks the 38th anniversary of the A-bombing of Hiroshima. Thousands of people will join together for a massive demonstration against the nuclear threat.

ANDREI PRAVOV
VLADIMIR MARKOV

WHAT THE REPUBLIC IS RICH IN...

THIS MARCH A TRADITIONAL INTERNATIONAL FAIR TOOK PLACE IN LYON, FRANCE. BUSINESSMEN CONSIDER IT AS ONE OF THE MOST PRESTIGIOUS IN THE WORLD. THE BYELORUSSIAN SSR RECEIVED AN INVITATION FROM THE SPONSORS TO PRESENT HER EXHIBITION THERE. THIS OFFER WAS TAKEN FOR GRANTED.

Over the years of Soviet power Byelorussia became one of the most developed republics of the USSR which equalls many developed countries of the world in economic potential. Now the industrial complex of Byelorussia includes more than one hundred industries, over 1,400 large production associations, combines, plants and factories. Over 400 Byelorussian products are exported to 86 countries.

What did the republic show at the Lyon Fair? First of all, «Belarus» tractors well known in France. Gerard Coche, President of the «Actif-Auto» French-Soviet joint-stock company which sells Byelorussia-made tractors, wrote the following to the Minsk Tractor Plant:

«There is a tough competition in tractor sales in France. 75 home and foreign companies offer their products. Of course, they must be high-quality, well-designed and reasonably priced. 'Belarus' tractors satisfy all these requirements.»

Minsk-made refrigerators are also well known in France. In 1981 French firms imported over 20,000 of these fridges. The Lyon Fair saw the new item, the «Minsk 22». It is a two-door refrigerator with quite a number of improvements.

Products of the Minsk Watch Factory are exported to many countries, including Switzerland with her renowned traditions in watch-making. Visitors to the Lyon Fair could see the «Luch 1816» watch which had been awarded a Grand Gold Medal at the Leipzig Fair in 1974, and «Luch 1956» — the winner of a Gold Medal at the Plovdiv Fair in 1981.

In Lyon, everybody admired the products of the Minsk Porcelain Factory. And, naturally, widely represented were items made by folk craftsmen, consumer goods, and musical instruments of Borisov and Molodechno factories. In all, 49 enterprises of Byelorussia participated in the fair.

Says Vyacheslav Nekrashevich, manager of the exhibition of Byelorussian SSR:

«Our exhibition was visited by over 400,000 people; there are 600 entries made in the guest book. Mr. F. Colombe, Mayor of the City of Lyon, called the Byelorussian exhibition «the star of the Soviet exhibition», and wrote in the guest book: 'I am proud that Lyon and Minsk are twinned cities. They have much in common: Minsk was the center of partisans' struggle against fascism, and Lyon was the center of the French Resistance...' By the way, six Byelorussian cities maintain friendly ties with cities of France.

«At the Lyon Fair we made thousands of new friends, who could learn about the life of our republic, about its economy and culture. They also learnt more about the desire of Byelorussian people for cooperation, strengthening mutual understanding and peace on Earth.»

YEVGENY TURAYKEVICH

METAL-BASED LUBRICANT

Researchers at Gomel University suggested the addition of powdered metal to a lubricant used in roller bearings in order to extend the life of these friction points. Superplastic metals were needed for this purpose.

In powdered form, such alloys when immersed in the lubricant, form tiny balls which reduce the friction coefficient two to four time. Wear resistance of assemblies and mechanisms increases accordingly.



On photo: New shopping center in the village Leninsky near Brest.

Photo by E. KOBIAK.

RURAL DEVELOPMENT IN THE BYELORUSSIAN SSR

In March 1982 the Central Committee of the Communist Party of Byelorussia and the Council of Ministers of the Byelorussian SSR adopted a resolution entitled «On measures to improve housing conditions of the rural population and to enhance rural development of the Republic in the eleventh Five-Year Plan period».

It is stated in the resolution that in the tenth Five-Year Plan period (1976—1980) there were built in the rural areas over 111,000 apartments with the total floor area of 6 million square metres 345 schools of general aducation for 176,300 pupils as well as pre-school children's institutions for 40,600 children, clubs and houses of culture with the housing capacity of 43,600 seats, 209 service establishments, automatic telephone stations with a capacity of 79,000 numbers. 5,300 kilometres of highways were built, 436,600 dwellings were switched to gas supply.

Social problems of the country-side are solved consistently and in a planned way, housing conditions of the rural population are improved, building work and organization of public services and utilities are enhanced in the rural areas.

The resolution deems it necessary to carry out construction work in the settlements of collective and state farms and other farming enterprises with due account to be taken of the experience accumulated by pilot construction projects as well as of economic profitablitity and the rural workers desires.

The resolution says that the question of location in rural settlements of enterprises processing farming produce subsidiaries of industrial enterprises as well as production units of collective and state farms is under review. This year long-term programmes of the development of medical care and cultural facilities will be worked out. The resolution provides for the expansion in the eleventh Five-Year Plan period of building of individual houses with the total floor area of 2,075,000 square metres.

Under the resolution, by the end of the Five-Year Plan period schools of general education for 53,090 pupils, pre-school children's institutions for 53,280 children, clubs and houses of culture for 41,690 people, hospitals with 4,020 beds, outpatient polyclinics for 5,995 visits per shift will be built. Automatic telephone stations with a capacity of 63,000 numbers will be put into effect, 6 television stations will be built or reconstructed.

The resolution further stipulates to ensure the fulfilment of the targets of the Five-Year Plan for the construction of public utilities projects, to lay 2099 kilometres of water-pipe lines, to build in the five-year period in the rural areas 2,488 kilometres of highways.

The resolution envisages a number of other measures aimed at improving housing conditions of the rural population and enhancing the rural development in the Republic in the eleventh Five-Year Plan period.

РЭХА МАСКОЎСКАГА КОНКУРСУ ІМЯ ЧАЙКОЎСКАГА

ПРОПУСК НА ВЯЛІКУЮ СЦЭНУ

ДАЎНО адгучалі ў Маскве апошнія акорды VII Міжнароднага конкурсу імя П. Чайкоўскага, але рэха яго яшчэ і сёння чуваць як у СССР, так і за мяжой. Журналісты, музыказнаўцы, крытыкі працягваюць каменціраваць маскоўскае свята музыкі, яго вынікі, расказваць пра ўдзельнікаў. І гэта не выпадкова: конкурс імя Чайкоўскага па праву лічыцца бадай ці не самым прэстыжным спаборніцтвам маладых музыкантаў свету. Хто атрымаў адну з яго высокіх узнагарод, як бы аўтаматычна набывае «пропуск» на вялікую сцэну. Сярод тых, каму ў свой час пашчасціла быць лаўрэатамі конкурсу, такія вядомыя цяпер музыканты, як Н. Шахаўская, М. Гутман, Э. Раўтыё, М. Хоміцар.

Але маскоўскае спаборніцтва — гэта не толькі барацьба за званні лаўрэатаў, не толькі працэс «нараджэння зорак», хоць амаль за дваццаціпяцігадовую яго гісторыю іх з'явілася нямала. Гэта яшчэ і унікальны агляд сусветнага выканаўчага майстэрства скрыпачоў, віяланчэлістаў, піяністаў, вакалістаў. У сёлетнім конкурсе ўдзел прыняло 346 маладых талентаў з 44 краін. Іх выступленні — яркія, запамінальныя, па-маладому гарачыя і разам з тым прафесіянальна дасканалыя — засведчылі: сённяшні ўзровень выканаўчага майстэрства маладых у параўнанні з учарашнім значна вырас.

Пацвярджэннем значнасці конкурсу імя Чайкоўскага з'яўляецца і той факт, што членамі яго журы ў розныя гады былі такія славутасці, як Давыд Ойстрах, Яфрэм Цымбаліст, Жозаф Сігеці. Сёлета ў яго складзе было 55 замежных і 23 савецкія музыканты — Ф. Лаірас (ЗША), Р. Капаралі (Італія), М. Аклер (Францыя), Л. Коган (СССР), Х. Накамура (Японія), Д. Робэртсан (Вялікабрытанія)...

Шырокае прадстаўніцтва на конкурсе, высокі аўтарытэт журы, магчымасць выяўлення ўзроўню выканаўчага майстэрства музыкантаў — усё гэта і тлумачыць велізарны інтарэс да маскоўскага свята музыкі і пасля яго заканчэння.

Як жа праходзіў VII конкурс, што ён даў удзельнікам, каго назваў пераможцамі? Яго праграма складалася з традыцыйных спаборніцтваў па названых вышэй спецыяльнасцях (яны праводзіліся ў тры туры) і доўжылася роўна месяц. Пра тое ж, што даў мінулы конкурс яго ўдзельнікам, гавораць яны самі.

Вальтэр ЧЫВІТАРЫЯЛЕ (Люксембург):

— Удзел у маскоўскім конкурсе карысны для кожнага. Мы многа там слухалі цікавай музыкі, сутыкаліся з незвычайнымі прачытаннямі твораў — гэта ўзбагаціла.

Далора ЗАІЦ (ЗША):

— Канешне, як і ўсе, найперш марыла аб прэміі. І атрымала — трэцюю! Але не менш для мяне значыць і набыты вопыт. Я займела яго, пазнаёміўшыся са свежымі інтэрпрэтацыямі рускай музыкі.

Матс РОНДЗІН (Швецыя):

— У Маскве я змог ацаніць свае сілы і павучыцца ў тых, хто здолеў паўней выказаць тое, што закладзена ў музыцы.

Мы прывялі толькі некалькі выказванняў, але і ў астатніх — іх рабілі ўсе музыканты — ёсць словы прызнання вялікага значэння конкурсу імя Чайкоўскага, словы ўдзячнасці яго арганізатарам і захаплення гасцінай сталіцай Савецкага Саюза.

Трэба сказаць, састаў канкурсантаў на гэты раз падабраўся надзвычай роўны — барацьба за прэміі была гарачай і цікавай. А перамаглі ў ёй У. Аўчыннікаў (СССР), П. Доханаў (Вялікабрытанія), М. Каяма (Японія) — піяністы; В. Мулава і С. Стадлер (СССР), Т. Ката (Японія), С. Гэйс і А. Кандэнес (ЗША) — скрыпачы; А. Мянезес (Бразілія), А. Рудзін (СССР), Г. Фаўст (ФРГ) — віяланчэлісты; Л. Забіляста, Х. Касімава, П. Бургуладзе, Г. Грыгаран, У. Чарноў (СССР), Д. Заіц (ЗША) — вакалісты.

Акрамя тых, хто ўдастоены званняў лаўрэатаў, яшчэ два добрыя дзесяткі ўдзельнікаў названы дыпламантамі, адзначаны спецыяльнымі прызамі.

Удзельнікі конкурсу раз'ехаліся па дамах — цяпер у іх новыя клопаты. І мы зычым ім яшчэ больш поспехаў, перамог, званняў лаўрэатаў і, вядома ж, новых сустрэч у Маскве.

ПРА ВЫСТАЎКУ ТВОРАЎ РЫГОРА ПАНАМАРЭНКІ

ЛЮБОЎ З ПЕРШАГА ПОЗІРКУ

Цяпер нават цяжка дакладна прыгадаць, калі, у якім годзе з'явілася жаданне расказаць у друку пра творчасць мастака-кераміста Лявона Панамарэнкі. У памяці засталася сустрэча з ягонымі тэракотавымі вазамі, аздобленымі глянцаваннем і васкаваннем. Падкупіла народнасць, цеплыня і індывідуальнасць вырабаў. Адчувалася, што за імі стаіць здольны творца, які ў стварэнні сучаснай формы не чужаецца народнай эстэтыкі керамічных форм, ведае і любіць традыцыйнае беларускае ганчарства.

Але было боязна даверыцца, як кажуць, «любові з першага позірку». Хацелася ўпэўніцца, што за гэтымі працамі стаіць шчыры пошук, творчае крэда мастака, а не модны рэверанс у бок традыцыі.

І сёння, калі ў залах Саюзу мастакоў БССР адкрыта персанальная выстаўка твораў Лявона Панамарэнкі, робіцца асабліва прыемна, што я ў сваіх ацэнках не памыліўся.

...Замілаванне народнай керамікай было з маленства. Тады ў яго роднай вёсцы Веткінь, што ў Рэчыцкім раёне, дзе ў 1937 годзе нарадзіўся будучы мастак, многія рэчы гаспадарчага ўжытку былі зроблены жыхарамі з гліны, дрэва, саломы і іншых мясцовых матэрыялаў. Да таго ж беларускае Палессе заўжды славілася і славіцца народнымі майстрамі — гаршкалепамі і ткаллямі, разьбярамі і вышывальшчыцамі.

Апрача духоўнага багажу, пачэрпнутага ў народных майстроў, была ў Л. Панамарэнкі вучоба на курсах пры Ленінградскім вышэйшым мастацка-прамысловым вучылішчы імя В. Мухінай, служба на Ваенна-Марскім Флоце, заняткі ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце на аддзяленні мастацкай керамікі. Была таксама і спакуслівая перспектыва застацца ў Ленінградзе, працаваць на Дзяржаўным фарфоравым заводзе імя М. Ламаносава. Але родны кут нястрымна цягнуў да сябе хлопца.

У 1950-х гадах мастак актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі і адраджэнні прафесійнай керамікі для масавай вытворчасці ў рэспубліцы. Стварыў шэраг узораў бытавой керамікі, у якой развіў пластыку ганчарных форм, вызваліў вазы і талеркі ад сухога арнаменту, аздобіў вырабы пацёкамі рознакаляровых паліў-глазураў.

Твораў для серыйнай і масавай вытворчасці на сёлетняй выстаўцы амаль няма. Яны даўно перасяліліся на пастаяннае жыхарства ў кватэры, рабочыя і грамадскія памяшканні. Будучы вучнем вядомага ленінградскага кераміста У. Альшэўскага, Панамарэнка пераняў у яго любоў да лаканічнай ганчарнай формы і многія сакрэты тэхнікі мастацкай апрацоўкі керамікі, якія асабліва спатрэбіліся ў час работы на Мінскім фарфоравым заводзе, дзе ён працаваў сем гадоў. Невялічкая ваза «Першая», створаная ў 1954 годзе, сведчыць не толькі пра пошукі Л. Панамарэнкам свайго стылю, але і пра тэндэнцыі развіцця беларускай керамікі тых гадоў, калі лаканічныя ўтылітарныя формы паступова саступалі месца дэкаратыўным кампазіцыям.

Удасканальваючы традыцыйныя прыёмы апрацоўкі вырабаў для тыражыравання і ўвёўшы ў гэтую галіну свае арыгінальныя рашэнні, мастак стварае і унікальныя выставачныя творы. Асаблівым хараством і цеплынёй вабяць наведвальнікаў выстаўкі камплекты чырвона-карычневых ваз, аб'яднаных у цыкл «Па родных матывах». Народная традыцыя, адчутая душой мастака, жыве ў тэктанічна выверанных, гарманічных сучаснаму асяроддзю формах. Бадай, ніхто з прафесійных мастакоў рэспублікі з такой пяшчотай і замілаваннем не ўмее раскрыць хараство народнай ганчарнай пластыкі. Чырвона-вохрыстыя вазы, дзякуючы манументальна выразнай, сакавітай пластыцы ганчарнай формы, адпавядаюць эстэтычным ідэалам сучасніка, вызначаюць накірунак, па якім павінна ісці мастацтва нацыянальнай керамікі.

Выстаўка Лявона Панамарэнкі — своеасаблівая справаздача мастака за апошнія 10—15 гадоў. Адметнасць экспазіцыі не толькі ў тым, што на ёй прадстаўлены надзвычай цікавыя творы мастака, але і ў тым, што яна прыадкрывае гледачам творчую лабараторыю майстра, сам ход увасаблення задумы, ідэі твора. Асобныя жывапісныя, графічныя і скульптурныя працы выступаюць на выстаўцы як самастойныя творы і як эскізы да керамічных кампазіцый. Напрыклад, паліхромныя сакавітыя букеты кветак, намаляваныя на керамічных плітках і на паперы, успрымаюцца адначасова як творы прыкладнога і станковага мастацтва. Натхнёны суквеццем красак на традыцыйных маляваных дыванах Шаркаўшчыны, мастак стварае выдатны цыкл кампазіцый — размалёвак па керамічнай плітцы.

Пад пэндзлем Л. Панамарэнкі традыцыйныя матывы букетаў, вянкоў, вазонаў узбагаціліся выявамі птушак, людскіх фігур, нацюрмортаў. Палітра пашырылася багатай гамай серабрыста-чорных адценняў, графіка ўзораў стала больш вытанчанай. Ды і настрой кампазіцый больш разнастайны: адны выклікаюць асацыяцыі спякотнага лета з нязгасным полымем сонца, другія вяртаюць у таямнічасць купальскай ночы, трэція вядуць да вераснёўскіх туманоў.

Асобную групу экспанатаў складаюць вялікія вазы для падлогі, выробленыя мастаком з шамоту.

І ў заключэнне хочацца адзначыць цудоўную экспазіцыю выстаўкі, створаную мастаком-графікам Яўгенам Кулікам, які здолеў стварыць у залах урачысты настрой, атмасферу свята сустрэчы з сапраўдным мастацтвам Лявона Панамарэнкі.

Міхась РАМАНЮК.

НА ЗДЫМКАХ: у выставачнай зале; «Узнёсласць» — работа Л. ПАНАМАРЭНКІ.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

УСЁ ПРА КНІГУ

Нядаўна пабачыў свет энцыклапедычны слоўнік «Кнігазнаўства» — унікальнае даведачнае выданне, у якім можна знайсці адказ на большасць пытанняў, зместам сваім звязаных са стварэннем, распаўсюджваннем, захоўваннем і пошукам твораў друку.

Усяго ў слоўніку змешчана дзве з паловай тысячы артыкулаў.

Значнае месца ў энцыклапедыі адведзена выдавецкай справе ў Беларусі. Вялікі аглядны артыкул «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка» складаецца з падраздзелаў, якія дазваляюць атрымаць поўнае ўяўленне пра месца і ролю кнігі ў жыцці беларускага народа — «Рукапісная кніга», «Пачатак кнігадрукавання. Выдавецкая справа», «Мастацтва кнігі», «Паліграфія», «Кніжны гандаль», «Бібліятэчная справа», «Бібліяграфія». Артыкул багата ілюстраваны. Змешчаны фотакопіі старонак «Смаленскага псалтыра», «Кнігі царстваў», выдадзенай Скарынай, ілюстрацыі Т. Макоўскага з кнігі «Гіпіка», вокладка зборніка Я. Коласа «Песні жальбы», супервокладка «Анталогіі беларускай народнай песні», ілюстрацыя Г. Паплаўскага да паэмы Я. Купалы «Яна і я» і г. д.

Расказваецца ў даведніку і пра «Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні», заснаванае 1 ліпеня 1913 года Б. Даніловічам, І. Луцкевічам і К. Шпакоўскім; Белтрэстдрук, які паклаў пачатак выпуску навукова-папулярнай літаратуры для вёскі...

Спецыяльныя артыкулы прысвечаны жыццю і выдавецкай дзейнасці Сымона Буднага; магілёўскіх гравёраў Вашчанкаў, што тварылі ў XVIII стагоддзі; беларускаму выдаўцу, збіральніку музычнага фальклору Антону Грыневічу; гісторыку і археолагу Арсену Маркевічу, які нарадзіўся ў мінулым стагоддзі ў Брэсце; беларускаму першадрукару Францыску Скарыне; выдаўцу, мовазнаўцу Браніславу Эпімах-Шыпілу...

Можна тут прачытаць і пра дзейнасць выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца», пра выдавецтва Б. Клецкіна, заснаванае ў Вільні ў 1910 годзе, якое ў 1921 годзе пачало выпускаць кнігі беларускіх пісьменнікаў, а таксама перакладную літаратуру на беларускай мове, пра Мінскі інстытут культуры.

Ёсць звесткі пра рэспубліканскія выдавецтвы «Беларусь», «Мастацкая літаратура», «Ураджай» і іншыя.

С. МАШКО.

ГАЛАСЫ МАЛАДЫХ

Люблю на старонках газет і часопісаў сустракаць новыя паэтычныя імёны. Новы паэт—заўсёды адкрыццё, заўсёды спадзяванне на радасць, якую кожнаму з нас, чытачоў, ён абяцае падараваць. Няхай пакуль што адчуваюцца няўмеласць, нявопытнасць маладога творцы, няхай у яго перасыхае ў роце ад хвалявання, але першы крок ужо зроблены, першае слова ўжо сказана, і наперадзе чакае доўгая дарога, і ён, пачатковец, быццам ветразь у неспакойным моры жыцця. Хочацца сказаць яму ўслед: «Смялей плыві. Удачы табе і шчасця».

Наша беларуская паэзія ніколі не скардзілася на адсутнасць маладых талентаў. Багата іх і сёння. Прычым прасочваецца такая тэндэнцыя: калі з дзесятак гадоў назад большасць паэтаў-пачаткоўцаў мела філалагічную адукацыю, то цяпер за пяро бяруцца маладыя людзі самых розных прафесій. У гэтым мне бачыцца заканамернасць часу: нястрымна расце інтэлектуальны і духоўны ўзровень нашага грамадства, яго творчыя сілы.

Сённяшні малады паэт—дзіця свайго урбанізаванага веку, гараджанін, але ён свята шануе мову сваіх продкаў, гісторыю роднай зямлі. Беларускія блакітныя крыніцы жывяць паэтаву душу.

Кожны чалавечы лёс, у тым ліку і творчы, можа скласціся па-рознаму. Але калі ў душы ёсць нязломны стрыжань, якім назаўсёды ён злучаны з лёсам свайго народа, — такі чалавек шчаслівы.

Прадстаўляю чытачам «Голасу Радзімы» маладых беларускіх паэтаў, чые творы апошнім часам з'явіліся на старонках рэспубліканскага часопіса «Маладосць».

Леанід ДАЙНЕКА,
паэт.

Віктар ГАРДЗЕЙ

Нарадзіўся ў 1946 годзе ў вёсцы Малыя Кругловічы Ганцавіцкага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Працуе ў рэдакцыі ганцавіцкай газеты «Савецкае Палессе». Выдаў паэтычныя зборнікі «Касавіца», «Чырвоныя грабеньчыкі». Выступае і ў жанры прозы.

* * *

Ёсць справа, ёсць клопат жыццёвы,
Ёсць стаіасці рупнай пара.
Крыніцы.
Палеткі.
Дубровы.
І — вечная прага дабра.

Ёсць смутак, ёсць радасць праз слёзы.
Ёсць горкія дні без вясла.
Пралескі.
Зарніцы.
Бярозы.
І — вечная прага святла.

Ёсць поле і вылет грачыны.
Ёсць плуг, і ты з плугам жыві.
Сяброўка.
Матуля.
Айчына.
І — вечная прага любві.

* * *

Пакуль ідзе смяротны бой
Паміж арлом і кобрай,
Штодзённа б'ецца клопат мой
Аб мыс надзеі добрай.

Пакуль на сонца ёсць ліміт,
З жыццём хачу быць злітны:
Няхай малюецца блакіт
Такі, як ёсць,— блакітны!

Пакуль арол святла ляціць
І лес грыбамі пахне,
Перагарыць зло, быццам ніць,
Касцёр хлусні ачахне.

Яны ж ужо не ўпершыню,
Усе, хто сее змовы,
Свой крышаць меч аб дабрыню —
Мой шчыт самааховы.

* * *

Жаўрукі вісяць званкамі
Пад вясёлкавай дугой.
Мчацца коні
Табунамі
На зары і пад зарой.

Паўз палянкі верасныя,
Між палёў,
Сярод падзей
Мчацца коні вараныя —
Ад людзей і да людзей.

Не абдзеленыя славай
І пяшчотаю сяла —
Стрэмя злева,
Стрэмя справа,
Выгіб звабліва сядла.

У тумане цуглі звоняць:
Конь, прастор і чалавек!
Не дагоняць,
Не дагоняць
Ні аўто, ні жорсткі век.

Залацісты ветразь грывы
Паласне на схіле дня.
Даль і вецер.
Бег імклівы.
Злітнасць часу і каня.

Людміла ПАЎЛІКАВА

Нарадзілася ў 1952 годзе ў пасёлку Ялізава на Бабруйшчыне. Скончыла факультэт прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна. Зараз працуе ў навукова-даследчым інстытуце.

Выступала з вершамі ў рэспубліканскім друку, падрыхтавала да выдання першую кнігу паэзіі.

ДУБ І ПЕРАКАЦІ-ПОЛЕ

Перакаці-поле
з пагардаю звярнулася да дуба:
— Шкада мне, дуб, цябе,—
стаіш, бы прыкаваны,
і свету аніколі не пабачыш.
А мне жывецца весела і лёгка.
Люблю я гэтак вандраваць,
што цяжка і прыпомніць мне цяпер,
дзе нарадзілася,
не думаю,
куды патраплю заўтра...
Перапыніў прамову гэту вецер,—
штурхнуў у карак
кволую расліну
і паімчаў.
У дуба толькі лісце паказытаў.
А дуб насупіў бровы і падумаў:
«Дык вось яго свабода:
яно свабодна ад зямлі,
ды паднявольна ветру!
А я зямлю трымаю каранямі,
і сам трымаюся трывала за яе,
таму і моц дае мне,
каб не кланяўся нікому».

АРГАН ПЕРАЛЕСКАЎ

Чаму я сумую! — Ні многа, ні мала,—
Што звонкія далі ясней і ясней.
Ізноўку мне восень вясну нагадала.
Асенні мой сум — гэта сум па вясне.
Па першым дыханні палёў і пралескі,
Па чыстых званах першароднай вады,
Дзе грае ўрачысты арган пералескаў
На сонечнай месе вясновай хады.
Дзе стане абачлівы неасцярожным,
Дзе шапку сівую адкіне курган.
Дзе кожнаю думкай і клетачкай кожнай
Няможна не быць маладой і прыгожай,
Калі ў пералесках зайграе арган.

СПАДЧЫННЫЯ КРОСНЫ

Бабуля ткала ручнікі,
І я нібы дапамагала:
Чаўнок хапала з-пад рукі,
Не разумеючы німала,
Навошта столькі ручнікоў! —
На ўсіх вяскоўцаў хопіць з гакам!
Бабуля ткала, час ішоў.
А мроі ўсе — былі за ганкам!
Там, дзе чакае рэхву брук,
Дзе рэха воклік мой паўторыць,
Там, дзе гарэзлівы раўчук
Мне радасць звонкую падорыць.
Час набіраў разгон цішком —
Туды, дзе люд яднаюць мары:
Адным вітком,
як ручніком,
Аперазаў Зямлю Гагарын...
І праз гады, нібыта крык,
Працяла думка нечакана,—
Што гэты велічны ручнік
Бабуляй быў наканаваны!
...Бабуля ткала ручнікі...
Яе навука не прапала:
Я сёння тку свае радкі,
Каб больш сяброў на свеце стала.

Віктар ШНІП



Нарадзіўся ў 1960 годзе ў вёсцы Пугачы на Валожынчыне. Зараз працуе будаўніком.

Друкаваўся ў рэспубліканскіх выданнях.

* * *

Самота сляпая мяне не атуліць.
Мне грае вятрыска на дудках саломы
Вясёлую песню, што пела матуля.
Па компасу сэрца іду я дадому.

* * *

А ён ішоў за зверам па слядах.
Быў дзікі звер паранены стралой.
Сціскаў кап'ё ў мазолістых руках.
Маўчала сцежка, плакала крывёй.
У роце перасохла, і ў вачах —
Сям'я галодная, галодны сам.
— Пастой жа, звер,—хрыпела
у грудзях.—
Табе ўцячы ўсё роўна я не дам.
І вось сышліся звер і чалавек.
Раўла, як звер паранены, рака.
Паветра чалавек кап'ём рассек...

Навошта у людзей ракеты у руках!

Змітрок МАРОЗАЎ



Нарадзіўся ў 1954 годзе ў вёсцы Язбы Крупскага раёна. Скончыў агранамічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Працаваў у Бялыніцкім упраўленні сельскай гаспадаркі. Зараз— на камсамольскай рабоце.

* * *

Над старэнькай адрынай
Зорны кош перакулены,
Пахне мёдам пчаліным,
Бачу постаць матуліну.
Кліча ласкава: «Дзімка,
Сырадой цёплы ў сенцах!..»
Успамін той — радзімка
Каля самага сэрца.

* * *

Спеў ранні жаўранка ў палях
Я чую ўжо здаля,
Мне сніцца жыта па начах,
І спелая ралля,
І сінякрылыя дажджы,
І дым над баразной,
І зерня жоўтыя лаўжы —
Усё, усё са мной.
Ды хіба можа ў забыццё
Такое адысці!
Пражыта цэлае жыццё,
А не гады ў жыцці!

Алесь ЖЫГУНОЎ



Нарадзіўся ў 1954 годзе ў вёсцы Троіца Шклоўскага раёна. Скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Зараз працуе настаўнікам.

Выступаў з вершамі ў рэспубліканскім друку.

* * *

Вятрамі насцежу дзверы,
Знайду цябе і — згублю.
Сябе да крывінкі праверу
На права сказаць:
— Люблю.

Падчас не стае даверу,
Не тое падчас раблю.
Сябе да крывінкі праверу
На права сказаць:
— Люблю.

Спакойна іду к бар'еру,
Застанься, прашу, малю...
Сябе да крывінкі праверу
На права сказаць:
— Люблю.

І слёзы будуць і вершы.
Дажджынкі ўначы лаўлю.
Сябе правяраю — верыш!—
На права сказаць:
— Люблю.

Бывай, не дагоніш, не вернеш.
Разлукай тугу наталю,
Пакутна прайду
Праз вернасць
І задыхнуся:
— Люблю!

* * *

Апошні воз дакошанага лета
Завозіць восень у бацькоўскі двор.
Суцішылася ў роздуме планета,
Глядзіць вачамі яблыкаў і зор.
І лістапад на дыбачках выходзіць,
І сосны над дарогаю рыпяць,
І з дня маіх крыклівых уваходзін
У гэты свет
мінула дваццаць пяць.
І мне ісці праз дождж,
праз лістабой,
На пераломе двух крутых стагоддзяў
З няшчырасцю, з няпраўдай весці бой
За дзень маіх бясхмарных уваходзін.

ЗІМНІ САД НА ЗАВОДЗЕ

Як трапіць з заводскага цэха ў лес або, скажам, на бераг ракі? Самы кароткі шлях вам падкажуць, бадай, на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава ў Мінску. Некалькі мінут — і перад вамі...

Лясная рака. На беразе, як жывыя, стаяць сосны. Слайд-карціна падсвечваецца знутры, імітуючы сонечнае ззянне. Уражанне такое, быццам стаіш на беразе ракі ў лесе, а за табой недзе ярка свеціць сонца, пранізваючы сваім святлом не толькі галінкі, але і кожную зялёную іголачку на іх. Гэта цудоўная карціна адбіваецца ў невялікім басейне, узмацняючы пачуццё рэальнасці. Тут адпачываюць рабочыя ў час кароткіх перапынкаў.

— А вы былі ў нашым зімнім садзе?—задаў мне пытанне майстар змены тэрмагальванічнага цэха Канстанцін Баранчук.

— Пакуль не давялося, — адказаў я.

Канстанцін Пятровіч загадкава ўсміхнуўся і павёў паказваць сад завода.

Прайшоўшы тэрмагальванічны цэх, мы, як у казцы, адразу трапляем у царства флоры. На падаконніках у гаршчочках кветкі: чырвоныя, ружовыя, бледна-ружовыя... І якіх тут толькі раслін няма! Экзатычная манстэра, бягоніі, кітайская ружа, якая цвіце амаль круглы год, алеандр, кактусы, агава, папараць, традысканцыі, пальмы фінікавыя і веерныя.

Інжынер па азеляненню Валянціна Данілюк з вялікай любоўю клапоціцца пра сваіх падапечных. А як добра яна расказвае аб кожнай расліне — не хочаш, а заслухаешся.

— Вось лімоннае дрэва,— паказвае яна мне невялікае дрэўца ў два з палавінай метры вышынёй з трыма разлапістымі галінкамі.—Вельмі баялася, што не прыжывецца, аднак...

— Валянціна Канстанцінаўна, а ці будзе яно пладаносіць?

— Будзе, — упэўнена адказала яна.—Варта яму ўвайсці ў сілу і крыху пасталець, таму што наш лімон яшчэ падлетак, калі можна так сказаць пра дрэва.

Побач з лімонам расце паласатая сансяўера. У народзе называюць гэтую расліну «шчупаковы хвост».

Пляцоўкі з раслінамі акаймоўваюць бардзюры, абкладзеныя цёмна-карычневай пліткай, якую бярэ ў палон хельксінія — зялёная бардзюрная расліна.

Паміж «зялёнымі зонамі» зімняга сада стаяць паліраваныя сталы, крэслы. На сталах свежыя газеты, часопісы, шахматы, шашкі. Ля глухой сцяны, на спецыяльным століку—тэлефоны: унутрызаводскі і гарадскі. А за метраў пяць ад століка з тэлефонамі, піяніна. Вось дзяўчына ў рабочым халаце села за інструмент, і зімні сад запоўніла прыгожая мелодыя.

У абедзенны перапынак, а то і ў «пяцімінутку», можна прыйсці сюды адпачыць. Тут чыстае, свежае паветра. Святло льецца праз спецыяльны дах, б'е ў вокны, якія займаюць поўнасцю адну доўгую сцяну.

Ёсць у зімнім садзе і невялікі басейн. Тут рыбам, відаць, нядрэнна: вада заўсёды свежая, багатая кіслародам.

Канстанцін Пятровіч налавіў рыбак у Свіслачы. Прыжыліся тут карасі, карпы, плотка, акуні і нават адзін рак.

— Трэба яшчэ аднаго злавіць для кампаніі гэтаму,—смяецца Баранчук і паказвае на рака, які хаваецца пад камень.

Частка тарцовых сцен закрыта люстрамі. Гэта вельмі ўдалая дэталь у афармленні зімняга сада, таму што выклікае пачуццё бясконцай перспектывы. На адной са сцен пано, якое зрабіў рабочы-гальванік Віктар Сямкоў. На пано — бярозавы гай. І не відаць гэтаму цудоўнаму гаю ні канца, ні краю.

...Вось і скончыўся перапынак. З добрым настроем рабочыя пакідаюць зімні сад.

А. ДЗІК.

Побач з укормленым шчанём яго малочны брат — паласатае тыграня — здаецца заморкам. Але з кожным днём сірата-тыграня набірае сілу. Ён ужо гуляе і, як лічаць ветэрынарныя ўрачы, усё страшнае для яго засталося ззаду. ...Чэхаславацкі цырк «Прага» гастраляваў у Магілёве. Тут у адной з тыгрыц з'явілася патомства. Выпадак унікальны, а яшчэ тыгрыца адмовілася карміць малых. Хутка больш слабейшы з двух загінуў. На дапамогу з Маскоўскага цырка прыехалі ветэрынарныя ўрачы. Яны зрабілі ўсё, каб выратаваць другога малога. А маці яму замяніў паляўнічы сабака настаўніка з Магілёва Станіслава Манкевіча. Сабака ласкава прыняў тыграня, корміць яго, сагравае.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

ЗГОДА ДЫ КАХАННЕ

Залатое вяселле адсвяткавалі Іван і Мар'я Шчасныя. Дома, ва ўтульнай кватэры, іх віталі, як і належыць на беларускім вяселлі, звонам цымбал і міскай грэцкай кашы. Лічыцца: хто першым лыжку возьме — той і «галава» сям'і. Усміхнуўшыся, першай узяла Мар'я...

Стогадовыя сёстры жаніха — Дар'я і Анастасія — зацягнулі жартоўную вясельную песню. Не абышлося і без традыцыйнага пераапранання. Дачка юбіляраў Ада, будаўнік-энергетык, працуе пад Рыгай. Апрануўшыся ў латышскія ўборы, яна і яе сям'я праспявалі на латышскай мове прывітальную песню. Дачка Міла і яе муж — інжынеры, нядаўна вярнуліся з Сірыі. У нацыянальным адзенні гэтай краіны яны прачыталі пявучым арабскім рэчытатывам квяцістае ўсходняе прывітанне. Дачка Нэлі, вядомы ў Беларусі мастак, паднесла бацькам сваю карціну, на якой яны намаляваны зусім маладымі.

Шасцярых дзяцей выгадавалі Іван ды Мар'я. Разам з усімі выхоўвалася і іх прыёмная дачка Вера.

Да выхаду на пенсію Шчасныя працавалі выкладчыкамі беларускай мовы. Муж і жонка — аўтары некалькіх падручнікаў па роднай мове для малодшых класаў. Таму юбілярам прыемна было прызнанне народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, які быў госцем вяселля, што роднай мове ён вучыўся па іх кніжках.

У Беларусі захоўваюцца сямейныя абрады і традыцыі мінулага. Так, урачыста святкуюцца сярэбраныя (праз 25), залатыя і нават брыльянтавыя (праз 75 гадоў сумеснага жыцця) вяселлі. Яны збіраюць разам усю радню, сяброў, суседзяў. Удзельнічаючы ў іх, моладзь вучыцца шанаваць сямейны ачаг. Не жадаючы адстаць ад старэйшых, яна стварае новыя сямейныя абрады: урачыстую рэгістрацыю нованароджанага, свята паўнелецця. У многіх месцах стала традыцыяй уручаць маладажонам у дзень вяселля ключы ад уласных кватэр, пабудаваных за кошт калгаса, саўгаса або прадпрыемства.

В. ХІЛЬКЕВІЧ.

Спорт

Смалявіцкае возера створана некалькі гадоў назад. На яго берагах ужо зелянее парк, ёсць лодачная станцыя, гульневыя пляцоўкі, элінг для захоўвання спартыўнага інвентару, працуе выратавальная станцыя.
На прайшоўшых нядаўна абласных спаборніцтвах каманда Смалявіцкай выратавальнай станцыі заняла агульнакаманднае першае месца па выратавальнаму мнагаборству.
НА ЗДЫМКУ: Андрэй БУЛАЎСКІ (злева) і Алег ПАЎЛАЎ — спартсмены, якім даверана абараняць гонар сталічнай вобласці на рэспубліканскіх спаборніцтвах па выратавальнаму мнагаборству.
Фота В. АЛЯШКЕВІЧА.

НА ТУРНІРЫ Ў ГАНОВЕРЫ

У заходнегерманскім горадзе Гановеры прайшлі міжнародныя спаборніцтвы па стральбе з лука. Парадавала Вольга Забугіна з Мінска, якая заняла першае месца ў сваёй групе (дзяўчаты да 17 гадоў), намнога апярэдзіўшы сваіх саперніц з Італіі, Фінляндыі, Швецыі і ФРГ.

ПРОЙДЗЕНА ПАЎДАРОГІ

Прыемная традыцыя: у апошнія гады спрэчку за званне чэмпіёнкі свету па міжнародных шашках у рашаючым фінальным паядынку вядзе прадстаўніца Беларусі.

Вось і ў цяперашнім спаборніцтве сустрэліся чэмпіёнка свету Вольга Левіна (Харкаў) і экс-чэмпіёнка мінчанка Алена Альтшуль. Іх матч складаецца з дванаццаці партый. Пройдзена палавіна дыстанцыі. Пакуль што наперадзе беларуская шашыстка — 3,5:2,5 ачка.

ПАСЛЯ ПЕРАПЫНКУ

Юнацкая зборная каманда СССР па вольнай барацьбе пасля адзінаццацігадовага перапынку зноў прыняла ўдзел у першынстве свету.

Маладыя асілкі нашай краіны на гэтых спаборніцтвах выступілі выдатна. Яны заваявалі сем залатых медалёў, адзін з якіх — на ліку мінчаніна Яўгена Куралёнка.

«АЛІМПІЯ» — КЛУБ ВЯДОМЫ

На юнацкім першынстве краіны па водных лыжах, якое прайшло ў Рыбінску, вызначыўся вядомы клуб «Алімпія» з Мінска. На яго рахунку найбольшая колькасць медалёў і ачкоў.

Чэмпіёнамі СССР сталі беларускія спартсмены — А. Мазоўка, Г. Важнік, В. Паўлава, Д. Яскевіч, Т. Аладзьева.

Гумар

Шатландзец убачыў д'ябла ў сваім пакоі і спытаў:

— А як вы сюды трапілі?

— Праз комін.

Гаспадар пацягнуўся да тэлефона, але д'ябал схапіў яго за руку.

— Прашу вас, не званіце свяшчэнніку! — усклікнуў ён.

— Пры чым тут свяшчэннік? Я хачу пазваніць камінару і сказаць, што яго заўтрашні прыход адмяняецца.

***

— Мне дастаткова паглядзець мужчыне ў вочы, і я ўжо ведаю, што ён пра мяне думае, — хваліцца Ліліта сяброўцы.

— Бедная ты мая...

***

— Шчыра кажучы, — сказаў агент страхавой кампаніі, — мы лічым крыху дзіўным, што ваш дом згарэў на наступны дзень пасля таго, як вы яго застрахавалі. Але мы цэнім рэпутацыю нашай фірмы і выплацім вам усё да апошняга цэнта. Складзіце, калі ласка, спіс усяго, што ў вас згарэла.

— Цудоўна. Скажыце, а можна мне ўнесці ў спіс пяць літраў бензіну?

***

Шатландзец гаворыць сябру:

— Я ніколі не іду ў той рэстаран, дзе ўжо раз абедаў.

— Я таксама не даю афіцыянтам на чай.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1539.